**Кобец Марыя Уладзіміраўна –лаўрэат літаратурнага конкурсу «Галасы Берагіні» Беларускага фонду культуры (2010), лаўрэат літаратурнай прэміі імя У. Калесніка Брэсцкага аблвыканкама ў намінацыі «Паэзія» (2012).**



Нарадзілася і жыве ў вёсцы Валішча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Пінскае медыцынскае вучылішча (1994), факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2017). Працавала загадчыкам Валішчанскага фельчарска-акушэрскага пункта (1998-2010), дырэктарам Валішчанскага сельскага Дома культуры (2010-2013).
З 2013 года – рэдактар карэспандэнцкага пункта г. Пінска РУП РТЦ «Тэлерадыёкампанія «Брэст». Заявіла аб сабе Марыя Кобец і як перакладчык. З арыгінальных моў вершы перакладала з сербскай, чарнагорскай, украінскай, польскай. Праз падрадкоўнікі рабіла мастацкія пераклады з азербайджанскай, дагестанскай, калмыкскай, хакаскай, туркменскай, таджыкскай, узбекскай, чачэнскай моў. Штуршком да працы такога кшталту стаў яе ўдзел у міжнародных фестывалях і форумах: фестываль славянскай паэзіі «Поющие письмена» г. Цвер (Расія, 2014), 51 Міжнародныя бялградскія сустрэчы, г. Бялград (Сербія, 2014), Міжнародны літаратурны форум у г. Аполе (Польшча, 2016), асамблея фестывалю славянскай паэзіі «Поющие письмена» (Расія, 2017), 54 Міжнародныя бялградскія сустрэчы, г. Бялград, (Сербія, 2017). Вершы друкаваліся ў перыядычных выданнях Беларусі (газеты: «Полесская правда», «Пінскі веснік», «Навіны Палесся», «Народная трыбуна» «Заря», «Краязнаўчая газета», «ЛіМ», «Звязда», «Народная газета»; часопісы: «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Гаспадыня», «Алеся»).

Творчасць Марыі Кобец, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі (з 2011 года) і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы (з 2016 года), высока ацэньваюць аўтарытэтныя крытыкі. Паэтка часта друкуецца ў рэспубліканскіх і замежных літаратурных часопісах і газетах, удзельнічае ў міжнародных фестывалях, шмат часу надзяляе перакладчыцкай дзейнасці. У творчым набытку Марыі Уладзіміраўны тры паэтычныя зборнікі: «Кроплі» (2011), «Палыновая квецень» (2016), “У белым ветразі завей” (2018). Акрамя таго паэтэса з’яўляецца ўдзельнікам шэрагу калектыўных паэтычных зборнікаў і анталогій, у тым ліку і міжнародных у такіх краінах як Албанія, Польшча, Сербія, Расія, Чачэнская рэспубліка, Кабардзіна-Балкарыя, Чувашыя, Малайзія, Мексіка.

Творца мае ўзнагароды: лаўрэат Брэсцкай абласной літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка (2012), Залаты лаўрэат “Міжнароднай Еўразійскай літаратурнай прэміі” у намінацыі “Мастацкая літаратура” (2018, Масква).

## Кнігі аўтара:

1. «Кроплі» (Мінск, «Мінкапрынт», 2011).
2. «Палыновая квецень» (Брэст, «Альтернатива», 2016).

Публицыстыка:

1. «Любоў і павагу настаўніцы» : газета «Пінскі веснік» (27.03.2009).
2. «Баба Зося» : газета «Пінскі веснік» (11.04.2009).
3. «Другі гатунак» : часопіс «МАЛАДОСЦЬ» (№ 4, 2013).
4. «Палессе самабытнае. На Піншчыне стала болей на адзін аб’ект культуры» : газета «ЛіМ» (25.11.2016).
5. «Тэатр — арганізм жывы, рухомы…» : «ЛіМ» (№ 10, 11.03.2016).
6. «Любімая з дзяцінства раёнка» : «Полесская правда» (№ 77 (12707), 24.09.2014).
7. «Паэтычныя сустрэчы ў Сербіі» : «Полесская правда» (№ 80 (13024), 07.10.2017)

ПУБЛІКАЦЫІ Ў ЛІТАРАТУРНЫХ ЗБОРНІКАХ:

1. «Я приветствую мир» : сборник поэтов-медиков Брестчины (Брест, «Брестская типография», 2012).
2. «Благословенный миг» : сборник произведений авторов Беларуси и Узбекистана, серия «Сугучча сэрцаў» (Мінск, «Выдавецкі дом «Звязда», 2013).
3. «Зорка Венера» : зборнік твораў аўтараў Беларусі (Мінск, бібліятэка часопіса «Гаспадыня», 2016).
4. «ARTE STIH» : анталогія Сусветнай паэзіі (Сербія, г. Бялград, 2016).
5. «ПРО ПОЕТ» : зборнік удзельнікаў Міжнароднага літаратурнага фестывалю ў г. Інджыа (Сербія), Інджыа, 2017 / рэдактар Міадраг Якшыч. – Бялград: Арте, 2017 (Београд: Скрипта).
6. Альманах VI Международного фестиваля славянской поэзии. ООО «МАГИ» «Из века в век», 2014, Россия, Тверь, 2014.
7. «БИТИ ИЛ’ НЕ БИТИ СТИХ ИЛИ СТАВ» : зборнік паэзіі ўдзельнікаў 51 Міжнароднай бялградскай літаратурнай сустрэчы. Выдавецтва : УКС, Францусκа, 7, 11000 Беоргад, 2014.
8. «Droga Franciszka» : зборнік удзельнікаў XXXI Міжнароднай кан- ферэнцыі ў г. Аполе (Польшча), Кракаў, 2016. Выдавецтва і друкарня таварыства славакаў у Польшчы.
9. Альманах поэтической ассамблеи XI Международного фестиваля славянской поэзии «Поющие письмена». Издательство ООО «МАГИ» «Из века в век», 2017, Россия, Москва, 2017.
10. «Кроз шуму симбола». 54 Міжнародныя бялградскія паэтычныя сустрэчы ў Сербіі. Выдавецтва: УКС, Францусκа, 7, 11000 Беоргад, 2017-10-13.

## Пераклады

1. «Белая ваўчыца як чорны лебедзь» : аб творчасці сербскага паэта Р. Радавіча, газета «НАРОДНАЯ ТРЫБУНА» (30.01.2015).
2. Пераклад вершаў дагестанскага паэта Міясата Муслімава, «ЛіМ» (25.08.2017).
3. «Прывітанне з Каракумскай старонкі» : «ЛіМ», 2017.
4. Пераклад вершаў чувашскага паэта В. Тургай, «ЛіМ» (№ 49, 08.12.2017).
5. Фарыд Гусейн. Вершы : Пераклады азербайджанскага аўтара з рускай мовы. Інтэрнэт-партал «Сугучча». http://sozvuchie.by/poeziya/ item/1606-faryd-gusejn-vershy.html.

## Литаратура


1. «Славлю Родину свою» : М. Елянеўскі аб творчасці аўтара, «Полесская правда», 2010.
2. «Вечарына з бляскам світальных рос» : С. Лазюк аб кнізе «Кроплі», «Полесская правда» (№ 2 (12425), 06.01.2012).
3. "Іскрынкі «Берасцейскага вогнішча» : Святлана Яскевіч, «Звязда» (№ 233 (27348), 04.12.2012).
4. «Лунінскай восені яркія фарбы» : У. Мікалаеў аб творчасці, «Полесская правда» (№ 97 (12520), 05.12.2012).
5. «Нібыта да чыстай крынічкі» : Г. Мазіна, «Народная трыбуна» (№ 50 (1140), 07.12.2012).
6. «Талент года» : аб творчых поспехах, «Полесская правда» (№ 103—104 (12526-12527), 29.12.2012).
7. «Паэзія стала часткай жыцця» : Н. Мілеўская аб жыцці і творчасці, «Полесская правда» (№ 18-19 (12545-12546), 07.03.2013).
8. «Сербскія сустрэчы» : Н. Мілеўская пра ўдзел у літаратурным форуме ў Сербіі, «Полесская правда» (№ 79 (12709), 01.10.2014).
9. «Поэтический прорыв в Европу» : В. Грышкавец пра ўдзел у літфоруме ў Сербіі, «Заря» (02.10.2014).
10. «Адкрыццё іншасвету» : К. Ладуцька пра ўдзел М. Кобец у літаратурным форуме ў Сербіі, «ЛіМ» (№ 9, 06.03.2015).
11. «Белорусская литература сегодня» : А. Карлюкевіч, часопіс «Простор» (Туркменістан) (№ 2, 2016).
12. «Літаратура — народная трыбуна» : Н. Мілеўская аб удзеле ў літаратурным фестывалі ў Сербіі, «Полесская правда» (22.10.2016).
13. "Марыя Кобец прэзентавала новы зборнік вершаў «Палыновая квецень» : Н. Мілеўская, «Полесская правда» (09.04.2017).

14. «Паэзія як лад жыцця» : Т. Палхоўская аб прэзентацыі кнігі «Палыновая квецень», «Полесская правда» (№ 52 (12996), 01.07.2017).
15. «Беларуская літаратура заваёўвае Балканы» : Пятро Савіч аб удзеле ў літаратурным форуме-2017 у г. Бялград (Сербія), «Радыё Рацыя».
16. «Вечарына Марыі Кобец». Відэаролік аб творчасці аўтара. КУП "Тэлерадыёкампанія «Пінск». У эфіры : 23.03.2016.
17. «Паэтка Марыя Кобец прэзентавала новы зборнік паэзіі». Відэаролік аб прэзентацыі кнігі «Палыновая квецень». Тэлерадыёкампанія «Варяг». У эфіры : 26.06.2017.
18. Праграма «Палеская скарбонка». Перадача аб жыццёвым і творчым шляху. КУП "Тэлерадыёкампанія «Пінск». У эфіры : 28.06.2017.
19. «Палыновая квецень». Відэаролік аб прэзентацыі кнігі «Палыновая квецень». Тэлерадыёкампанія «Брэст». У эфіры 04.07.2017.
20. «Открытие поэта» : В. Грышкавец на кнігу «Кроплі», газета «Заря» (18.06.2011).
21. «Берасцейскае вогнішча не затухае» : Л. Яніцкая, водгук на кнігу «Кроплі», газета «Заря» (09.07.2011).
22. «Зямлі прыцягненне і вольнае неба» : К. Ладуцька, рэцэнзія на кнігу «Кроплі», газета «ЛіМ» (№ 27, 08.07.2011).
23. «Мой паратунак — слова» : В. Грышкавец на кнігу «Кроплі», часопіс «Нёман» (№ 2, 2012).
24. "Палітра фарбаў «Палыновай квецені» : Н. Аляхновіч на кнігу «Палыновая квецень», «Полесская правда» (03.12.2016).
25. «Якія фарбы ў шчырасці?» : Н. Аляхновіч на кнігу «Палыновая квецень», «ЛіМ».
26. «Кроплі датклівай душы» : А. Шушко да зборніка «Кроплі» (Мінск, «Мінкапрынт», 2011). «Зярняткі ўзыходзяць…» : Алесь Карлюкевіч да кнігі «Палыновая квецень» (Брэст, «Альтернатива», 2016).